Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

УДК 947.2:323.311

Дамарад
Аляксей Анатольевіч

# ІНТЭГРАЦЫЯ ШЛЯХТЫ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАД ДВАРАНСТВА РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Аўтарэферат
дысертацыі на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

**Мінск, 2007**

Работа выканана ва ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт»

**Навуковы кіраўнік –** **Рассадзін Сяргей Яўгенавіч**
доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт»

**Афіцыйныя апаненты:** **Фамін Віталь Міхайлавіч**
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

**Лугаўцова Святлана Леанідаўна**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта

**Апаніруючая арганізацыя –** установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт»

Абарона адбудзецца 7 снежня 2007 года ў 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 02.21.03 пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка» па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, д. 18, ауд. 482, bagdanovich.sovet@tut.by, тэл. 2008253.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка».

Аўтарэферат разасланы 6 лістапада 2007 г. 2021

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый І.І. Багдановіч

ХН // Х ...
(С ...)

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь працы з навуковымі праграмамі і тэмамі**

Даследаванне праводзілася па ініцыятыве аўтара на базе аспірантуры Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта. Тэма дысертацыі была зацверджана Саветам БДТУ 30 лістапада 2004 г. (пратакол № 3). Праблематыка дысертацыйнага даследавання цесна звязана з навуковай дзейнасцю кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта, у тым ліку з планавымі навукова-даследчымі работамі «Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі».

**Мэта і задачы даследавання**

Актуальнасць і ступень вывучанасці вызначылі мэту дысертацыйнага даследавання: устанаўленне дакладнага характару інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі ў канцы XVIII—сярэдзіне XIX ст.

Для рэалізацыі названай мэты былі вызначаны наступныя задачы:

- устанавіць ступень адкрытасці дваранскага саслоўя да інтэграцыі ў яго шляхты;
- вызначыць асноўныя шляхі інтэграцыі шляхты ў склад расійскага дваранства;
- выявіць асноўныя механізмы інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі;
- прасачыць вынікі інтэграцыі для тытулаванай і нетытулаванай шляхты беларускіх зямель, устанавіць адрозненні;
- раскрыць аб'ектыўныя і суб'ектыўныя аспекты працэсу змяншэння колькасці дваранства ў беларускіх губернях і паказаць яго вынікі.

Аб'ектам дысертацыйнага даследавання з'яўляецца сацыяльна-палітычная гісторыя Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII—сярэдзіна XIX ст.). Прадмет даследавання—працэс інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад расійскага дваранства.

**Палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

1. Працэсы інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі мелі складаны характар. Дваранскае саслоўе Расійскай імперыі было адкрыта да інтэграцыі ў яго шляхты беларускіх зямель. Такое становішча падтрымлівалася цэнтральнымі ўладамі Расійскай імперыі. Частка шляхты ўдзельнічала ў антырасійскіх выступленнях, паказваючы сваё нежаданне ўваходзіць у склад расійскага дваранства. Яна бачыла сябе як нешта неад'емнае ў дачыненні да польскага нацыянальна-шляхецкага кола. У той жа час, арыстакратычныя шляхецкія фаміліі імкнуліся наблізіцца да расійскага імператарскага двара, што дазваляла ім інкарпаравацца ў расійскае дваранства.



Нацыянальная бібліятэка Беларусі

2. Нетытулаваная шляхта, уцягнутая ў працэс інтэграцыі ў склад расійскага дваранства, арыентавалася на саслоўнага лідара—арыстакратыю. Даследаваныя дакументы паказваюць, што перад нацыянальнымі, рэлігійнымі, палітычнымі інтарэсамі шляхта аддавала перавагу маёмасным.

3. Прычынамі «разбораў» сталі практычныя інтарэсы расійскай саслоўна-феадальнай манархіі. Апорай яе было дваранства, часткай якога стала беларуска-літоўская шляхта. Але колькасна яна гэтае дваранства ледзь не перавышала. Улада Расійскай імперыі проста вымушана была дабівацца адпаведнай прапарцыйнасці колькасці дваран у «літоўскіх» і «беларускіх» губернях з аднаго боку і ўнутранымі з другога. Акрамя палітычных прычын колькаснага памяншэння шляхты, прасочваецца імкненне расійскіх уладаў не дазволіць трапіць у шэрагі імперскага дваранства асобам, якія набылі шляхецтва падманам. Гэтым самым дасягаліся дзве мэты: не размывалася сацыяльная апора манархіі, і адначасова пашыраліся фіскальныя магчымасці дзяржавы на беларускіх землях.

4. На выніку інтэграцыі шляхты ў склад дваранства Расійскай імперыі аказалі ўплыў таксама іншыя фактары. Становішча і колькасць шляхты, прызнанай у дваранстве, залежала ад мясцовых умоў. У асобных «літоўскіх» і «беларускіх» губернях колькасць прызнаных у дваранстве значна адрозніваецца.

5. Галоўнай перашкодай інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі ў першыя дзесяцігоддзі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай была жывучасць старых соймавых традыцый, якія не дазвалялі ў поўнай меры рэалізоўваць прынцыпы дваранскага прадстаўніцтва ў заходніх губернях.

6. Працэс інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі быў аб'ектыўнай, двухбаковай з'явай. Трэба ўлічваць, што Расійская імперыя была не нацыянальнай, а ўсё ж у першую чаргу саслоўнай дзяржавай. Даследаваны перыяд ад канца XVIII па сярэдзіну XIX ст. стаў пераходным ад абсалютысцкай да нацыянальна-буржуазнай манархіі. З пункту гледжання тагачаснай імперскай ідэалогіі, шляхта беларускіх зямель разглядалася ў якасці гістарычна неад'емнай часткі дваранства Расійскай імперыі. Саслоўная дваранска-феадальная салідарнасць расійскага дваранства ў дачыненні да шляхты праявілась у тым, што статус «доказывающего дворянство», як намі ўстаноўлена, дазваляў на практыцы карыстацца дваранскімі правамі.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Дысертацыйнае даследаванне мае завершаны характар і з'яўляецца самастойным аўтарскім даследаваннем, выкананым без сааўтарства. Работа прысвечана пытанням унутрысаслоўнай інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у

склад расійскага дваранства пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. У ходзе навуковай працы былі праведзены пошук, сістэматызацыя, археаграфічны і крыніцазнаўчы аналіз дакументаў. У працэсе работы над дысертацыяй упершыню вывучана, сістэматызавана і ўведзена ў навуковы абарот вялікая колькасць архіўных крыніц. Акрамя таго, упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі ў навуковы абарот уведзены дваранскія спісы Віленскай губерні па стану на 1831 і 1836 гг., якія ніводнага разу не выдаваліся. Увядзенне згаданых дакументаў у навуковы абарот дазваляе больш дакладна выконваць даследаванні па сацыяльна-палітычных і генеалагічных пытаннях гісторыі Беларусі.

**Апрабацыя вынікаў даследавання**

Палажэнні і высновы дысертацыйнага даследавання абмяркоўваліся на паседжаннях кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ. Вынікі даследавання агучваліся на 4 рэспубліканскіх канферэнцыях:

- на 69 навукова-тэхнічнай канферэнцыі БДТУ (Мінск, 31 студзеня—5 лютага 2005 г.);
- на IV міжнароднай канферэнцыі гісторыкаў (Мінск, БДУ, 2005 г.);
- на X Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў Беларусі «НДРС-2005» (12-14 лютага 2006 г., Мінск);
- на міжнароднай навуковай канферэнцыі маладых вучоных «Моладзь у навуцы – 2006» (17-19 кастрычніка 2006, Мінск).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі дысертацыі апублікаваны ў 5 публікацыях, у тым ліку, у двух зборніках навуковых артыкулаў, навуковым часопісе і матэрыялах навуковых канферэнцый, якія адпавядаюць пункту 18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і званняў. Агульны аб'ём навуковых артыкулаў складае 1,5 аўтарскага ліста, а астатніх матэрыялаў—0,5 аўтарскага ліста.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, 4 главаў, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц і дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі складае 129 старонак, з іх дадаткі—12 старонак. Колькасць выкарыстаных бібліяграфічных крыніц — 292.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах** абгрунтоўваецца *актуальнасць* тэмы дысертацыі. Разглядаецца сутнасць інтэграцыі, аргументуюцца храналагічныя межы даследавання. Неабходнасць паглыбленага вывучэння інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі тлумачыцца тым, што аналізу патрабуе найважнейшае для шляхты пытанне: захаванне сацыяльнага статусу пасля падзелаў Рэчы Паспалітай ў канцы XVIII—сярэдзіне XIX ст. Таксама абгрунтоўваецца непарыўнасць інтэграцыйных працэсаў, іх вопыт і дасягненні, якія ў значнай ступені з'яўляюцца базай і асновай для сучаснай

беларуска-расійскай інтэграцыі. Акрэсліваюцца прынцыпы уключэння ў даследаванне шляхецкіх родаў паводле тэрытарыяльнай прыкметы, а не паводле нацыянальнай, што адпавядае прынцыпам, пакладзеным у аснову пабудовы вышэйшага саслоўя ў Расійскай імперыі. Падкрэсліваецца, што такі падыход дазваляе з большай аб'ектыўнасцю разгледзіць працэс інтэграцыі шляхты ў склад дваранства Расійскай імперыі без уплыву нацыянальных фактараў.

У першай главе **"Гістарыяграфія, крыніцы і метадалогія даследавання"** разглядаецца стан распрацоўкі праблемы і аналізуюцца крыніцы даследавання выкарыстаныя ў працэсе працы над дысертацыяй, апісваюцца метады і метадалогія даследавання.

**Гістарыяграфія праблемы.** Комплекс прац, якія маюць дачыненне да інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі, падзяляецца на некалькі груп. У першую ўваходзяць працы дакастрычніцкіх расійскіх гісторыкаў. Другую групу даследаванняў складаюць працы савецкіх, постсавецкіх і замежных даследчыкаў, у якіх разглядаюцца асобныя пытанні гісторыі шляхты і дваранства ў канцы XVIII—XIX ст. Падобныя даследаванні даюць магчымасць вызначыць асноўныя тэндэнцыі ў працэсе інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі, што мелі месца ў вывучаемы перыяд.

Расійскія гісторыкі XIX ст. у сваіх агульных даследаваннях закраналі пытанні далучэння Беларусі да Расійскай імперыі і прыстасавання сацыяльнай структуры грамадства да новых умоў. Гэтыя аспекты гісторыі шляхты асвятляюцца ў працах В. В. Ключэўскага, М. І. Кастамарава, М. Г. Устралава[1]. Вялікую колькасць фактаў па гісторыі шляхты ў XIX ст. утрымлівае даследаванне А. А. Карнілава[2]. Вывучэнню становішча насельніцтва ў беларускіх землях, у тым ліку і шляхты, у перыяд царавання Кацярыны II і Паўла I свае працы прысвяціў П. Н. Жуковіч[3].

Вялікі ўклад у вывучэнне дваранскага саслоўя зрабіў С. А. Корф, які раскрыў мясцовыя асаблівасці жыцця шляхты беларускіх зямель[4]. Аналіз становішча ўсяго дваранства ў Расіі правёў у сваім даследаванні «Дворянство в

---

[1] Ключевский, В.О. Русская история. Полный курс лекций. В 3-х книгах / В. О. Ключевский. Кн. 3. Ростов н/Д.: Изд-во «Феникс», 1998.—576 с.Костомаров, Н. И. Исторические монографии и исследования. / Н. И. Костомаров. Т. 1—2. М., 1990.; Костомаров, Н. И. Старый спор: Последние годы Речи Посполитой / Н. И Костомаров. – М., 1994. – 356 с.; Устрялов, Н. Г. Русская история до 1855 года, в двух частях / Н. Г. Устрялов.—Петрозаводск: Корпорация «Фолиум», 1997.—958 с.

[2] Корнилов, А. А. Курс истории России XIX века / А. А. Корнилов; Вступ. ст. А.А.Левандовского.—М.: ООО «Издательство Астрель»: ООО «Издательство АСТ», 2004.—862 с.

[3] Жукович, П. Н. Дворянство, крестьянство и мещанство в западно-русских областях, присоединенных по второму и третьему разделу / П. Н. Жукович // Журнал Министерства народного просвещения. – 1915. – № 5. – С. 87–145.; Жукович, П. Н. Западная Россия в царствование императора Павла I / П. Н. Жукович // Журнал Министерства народного просвещения. – 1916 – № 6. – С. 183–226.; Жукович, П. Н. Сословный состав населения западной России в царствование Екатерины II / П. Н. Жукович // Журнал Министерства народного просвещения. – 1915. – № 1. С. 76–109; № 2. С. 257–321; № 5. С. 130– 178.

[4] Корф, С. А. Дворянство и его сословное управление за столетие (1762 – 1855 гг.) / С. А. Корф. – СПб., 1906. – 168 с.

России с XVIII в.» А. М. Рамановіч-Славацінскі[5]. Не вылучае з агульнай масы расійскага дваранства шляхту М. Яблачкаў[6].

Надзвычай карыснай для вывучэння інтэграцыі тытулаванай шляхты у расійскае дваранства з'яўляецца праца Е. П. Карновіча[7]. Яна прысвечана паходжанню і эвалюцыі тытулаў расійскай арыстакратыі, у прыватнасці, дэвальвацыі княскай годнасці ў Расійскай імперыі. Аўтар асабліва падкрэслівае колькаснае ўзбагачэнне расійскай арыстакратыі праз уключэнне ў яе шэрагі тытулаванай шляхты беларускіх зямель.

У генеалагічных даследаваннях расійскага дваранства шляхта беларускіх зямель разглядаецца як яго складовая частка. Значнасць прац П. В. Далгарукага і А. Б. Лабанава-Растоўскага ў тым, што даследчыкі паказалі шлюбна-роднасныя сувязі тытулаванай шляхты і расійскай арыстакратыі[8].

Расійскія даследчыкі-геральдысты не абмінулі ўвагай і шляхту. А. Б. Лакіер, які вывучаў вытокі геральдычнай сістэмы Расійскай імперыі, у сваім даследаванні «Русская геральдика» асобна падкрэсліваў, што уключэнне ў яе шляхты былой Рэчы Паспалітай значна ўзбагаціла расійскую геральдычную сістэму[9]. А. А. Бобрынскі даследаваў роды, унесеныя ў Агульны гербоўнік Расійскай імперыі[10]. На аснове гэтага даследавання можна зрабіць высновы аб ступені даверу цэнтральных расійскіх уладаў да шляхты беларускіх зямель.

Тытулаваным дваранскім фаміліям прысвечана даследаванне С. А. Васільевіча[11]. Аўтар ставіць у адзін шэраг з расійскай арыстакратыяй тытулаваныя шляхецкія роды Беларусі, паказвае, што расійскае дваранства было адкрыта для інтэграцыі ў яго князёў, графаў і баронаў былой Рэчы Паспалітай.

Адным з першых беларускіх даследчыкаў закранаў становішча шляхты М. В. Доўнар-Запольскі. У абагульняючай працы «История Белоруссии» ён справядліва адзначае, што цярпімае стаўленне да паланізацыі Беларусі ў першай палове XIX ст. стварала падмурак антырасійскага руху і стрымлівала інтэграцыю шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі[12].

Савецкі перыяд развіцця айчыннай гістарыяграфіі вызначыўся тым, што вывучэнне сацыяльных вярхоў было ідэалагічна незапатрабаваным. Тым не

---

[5] Романович-Словатинский, А. М. Дворянство в России с XVIII в. / А. М. Романович-Словатинский. – Спб, 1864 г. – 340 с.
[6] Яблочков, М. История дворянского сословия в России / М. Яблочков. – СПб., 1876. – 198 с.
[7] Карнович. Е.П. Родовые прозвания и титулы в России и слияние иноземцев с русскими / Е. П. Карнович. – СПб., 1886. – 236 с.
[8] Долгорукий, П. В. Российская родословная книга / П. В. Долгорукий. Ч.1. СПб., 1854. Ч.3. СПб., 1856.; Лобанов-Ростовский, А. Б. Русская родословная книга: В 2 т. / А. Б. Лобанов-Ростовский. – Т.1. Спб., 1895.—467 с., Т.2. СПб., 1895.—481 с.
[9] Лакиер, А. Б. Русская геральдика / А. Б. Лакиер.—СПб., 1855.
[10] Бобринский, А. А., граф. Дворянские роды, внесенные в «Общий гербовник Всероссийской Империи» / А. А. Бобринский. – СПб., 1890. Ч.I-II.
[11] Васильевич, С. А. Титулованные роды Российской Империи / С. А. Васильевич. – СПб., 1910. – 498 с.
[12] Довнар-Запольский. М. В. История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. – Мн.: Беларусь, 2003 —680 с.

менш, у гэты перыяд з'явілася грунтоўнае даследаване П. Г. Казлоўскага «Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII—первой половине XIX в.»[13]. У манаграфіі аўтар даследуе не толькі сялянскія надзелы і павіннасці. Але і эвалюцыю землеўладання дробнай і заможнай шляхты, яе суадносіны па паветах, колькасны склад і пранікненне на тэрыторыю Беларусі землеўладальнікаў з унутраных губерняў Расійскай імперыі.

Зменам у адміністрацыйным кіраванні XIX ст. у Расійскай імперыі прысвечана праца Я. П. Ярошкіна[14]. Заслуга аўтара ў тым, што ён паказвае неабходнасць гэтых змен, а таксама аналізуе шляхі магчымага атрымання дваранства.

Грунтоўнасцю вызначаюцца артыкулы А. П. Грыцкевіча[15]. У іх даследчык тлумачыць вытокі вялікай колькасці шляхты на беларускіх землях, вызначае яе дыферэнцыяцыю. Фактычна адзінае айчыннае даследаванне роду Сапегаў таксама належыць А. П. Грыцкевічу[16].

Вялікай інфарматыўнасцю вызначаюцца працы С. В. Думіна, у якіх аўтар не толькі звяртаецца да асобных груп шляхецкага насельніцтва, але і сістэматызуе пацверджанні дваранства беларускай шляхтай[17]. Галоўны недахоп гэтых даследаванняў у тым, што даследчык не ўключыў у іх дадзеных па Віленскай губерні.

З атрыманнем дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікай Беларусь, павысілася цікавасць да гісторыі шляхецкага саслоўя ў айчыннай гістарыяграфіі. Першымі даследаваннямі становішча шляхты ў канцы XVIII—першай палове XIX ст. сталі працы С. Л. Лугаўцовай і Т. Н. Тумiловіч[18].

Аспектам нацыянальнай саслоўнай палітыкі ў дачыненні да шляхты прысвечаны артыкулы С. Д. Жмуроўскага і У. М. Смяховіча[19].

---

[13] Козловский, П. Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII—первой половине XIX века / П. Г. Козловский. – Мн., Наука и техника, 1982. – 206 с.

[14] Ерошкин, Е. П. История государственных учреждений дореволюционной России / Е. П. Ерошкин. – М.: «Высшая школа», 1983. – 352 с.

[15] Грицкевич, А. П. Формирование феодального сословия в Великом княжестве Литовском и его правовые основы (XV – XVI вв.) / А. П. Грицкевич // Первый литовский статут 1529 года. Материалы республиканской научной конференции, посвящённой 450-летию Первого Статута. Вильнюс, 1982. – С. 65–73.; Грыцкевіч, А. П. Беларуская шляхта / А. П. Грыцкевіч // Спадчына. – 1993. – №1. – С. 11–16.

[16] Грыцкевіч, А. П. Сапегі / А. П. Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т.6. Кн. 1:Пузыны—Усая / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш.—Мн.: БелЭн, 2001.—591 с.: іл. С. 223—228.

[17] Думин, С. В. Татарские князья в Великом княжестве Литовском / С. В. Думин // Acta Baltico-Slavica. – Wroclaw, 1991.; Дворянские роды Российской империи. Том 2. СПб.,1995. – 262 с.; Смоленское дворянство / Сост. Л.А. Верховская; Под науч. ред. С. В. Думина; Рос. дворян. собр.; Смолен. землячество. М.; Изд-во Смолен. дворян. Землячества (Тип. ЦНИИС), 1999. Вып. 4. Родовые гнезда. 45 с.: ил.; Dumin, S., Gorzynski, S. Spis szlachty wylegitymowanej w guberniach Grodzinskiej, Minskiej, Mohulewskiej, Smolenskiej i Witebskiej / S. Dumin, S. Górzyński. – Warszawa, 1992. – 112 s.

[18] Луговцова, С. Л. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII—первой половине XIX века / С. Л. Луговцова. – Мн.: БГПУ им. М.Танка, 1997.—78 с.; Тумiловіч, Г. М. Дваранства Беларусі ў канцы XVIII—першай палове XIX ст. / Г. М. Тумiловіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – №4. – С. 54–57.; Тумилович Г. Н. Дворянство Белоруссии в конце XVIII—первой половине XIX в.: Автореф. дис. … канд. ист. наук / Г. Н. Тумилович. – Мн., 1995.; Тумiловіч Г. М. Палітыка царызму ў адносінах да дробнай шляхты Беларусі ў канцы XVIII—першай палове XIX ст. / Г. М. Тумилович // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII—пачатку XIX ст. Зборнік навуковых прац.—Мн., 1995. С. 114—128.

[19] Жмуроўскі, С. Д. Палітыка самадзяржаўя ў адносінах да рускіх на Беларусі ў канцы XVIII—пачатку XIX ст. / С. Д. Жмуроўскі // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII—пачатку XIX ст. Зборнік

Даследавала паўстанне 1830–1831 гг. В. В. Гарбачова[20]. Важным з'яўляюцца звесткі аб колькасці пакараных за удзел у ім, а таксама аб рэпрэсіўных мерах царскага ўрада.

Канфіскацыю шляхецкіх уладанняў закранаў у сваім даследаванні У. А. Сосна [21]. Дваранскія выбары і становішча Беларусі ў канцы XVIII ст. даследуе Я. К. Анішчанка[22].

Вельмі грунтоўнае даследаванне становішча беларускага дваранства ў другой палове XIX ст. правёў А. П. Жытко[23]. Але даследчык звяртаецца і да становішча шляхты ў ранейшы перыяд, што дазваляе прасачыць прычыны зменаў у яе становішчы.

А. М. Люты як аўтар манаграфіі «Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў Беларусі ў другой палове XVIII—першай палове XIX ст.»[24]. На падставе аналізу статыстычных крыніц А. М. Люты даказаў іх недакладнасць, што з'яўляецца надзвычай важным пры вывучэнні колькасці дваран на беларускіх землях.

**Крыніцы даследавання.** Асноўную частку крыніц дысертацыі складаюць архіўныя фонды губернскіх дваранскіх сходаў. Такія дакументы захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску (ф. 319, ф. 2066, ф. 2512). Архіўныя дакументы па Віленскай і Гродзенскай губернях захоўваюцца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Вільнюсе. Гэта дакументы фонда 391 ЛДГА «Канцылярыя Віленскага губернскага дваранскага схода», які ўтрымлівае не толькі справы аб дваранстве, але і вельмі цікавую перапіску паміж чыноўнікамі па пытаннях дваранскіх выбараў, парушэннях законаў на іх і г.д. Пэўную цікавасць уяўляюць таксама прыватныя фонды ЛДГА. Намі выкарыстаны архіўны фонд «Тышкевічы — графы» (ф. 716), які ўтрымлівае канкрэтныя сведчанні аб фактычнай інтэграцыі шляхты ў склад расійскага дваранства.

Падаўляючая частка архіўных спраў па Магілёўскай губерні ў беларускіх архівах не захавалася. Але іх копіі захоўваюцца ў Расійскім дзяржаўным

---

навуковых прац.—Мн., 1995. С. 55—61.; Смяховіч. М. У. Адносіны самадзяржаўя да польскага насельніцтва Беларусі ў гады падзелаў Рэчы Паспалітай / М. У. Смяховіч // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі у канцы XVIII—пачатку XIX ст. Зборнік навуковых прац.—Мн., 1995. С. 39—54.

[20] Гарбачова, В.В. Паўстанне 1830—1831 гг. на Беларусі / В. В. Гарбачова. – Мн., 2001. – 420 с.

[21] Сосна, У.А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII—першай палове XIX ст. / У. А. Сосна. – Мн.: БДУ, 2000. - 115 с.

[22] Анішчанка. Я. К. Дваранскія выбары ў Полацкім намесніцтве 1789 г. / Я. К. Анішчанка // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук. – 1992. – № 3—4. С. 67–74.; Анішчанка, Я. К. Перадумовы генеральнага межавання ўсходняй Беларусі / Я. К. Анішчанка // Старонкі гісторыі Беларусі.—Мн., 1992. – С. 116–127.; Анішчанка, Я. К. Прававы статус беларускіх земляў у палітыцы адміністрацыі Кацярыны II / Я. К. Анішчанка // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 1994. – № 2. – С. 80–86.

[23] Жытко, А. П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861—1914 гг.: Манаграфія / А. П. Жытко. – Мн.: БДПУ, 2003. – 223 с.

[24] Люты, А. М. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў Беларусі ў другой палове XVIII—першай палове XIX ст.: манаграфія / А. М. Люты. – Мінск. БДПУ, 2004. – 320 с.

гістарычным архіве ў Санкт-Пецярбургу ў архіўным фондзе Дэпартамента Герольдыі (ф. 1343).

Другую групу крыніц складаюць афіцыйныя геральдычныя выданні, якія сведчаць аб уключэнні ў геральдычную сістэму Расійскай імперыі беларускіх шляхецкіх родаў. Такімі крыніцамі з'яўляюцца «Агульны гербоўнік дваранскіх родаў Расійскай імперыі» і «Гербоўнік Царства Польскага».

Выкарыстоўваліся пры падрыхтоўцы дысертацыі таксама разнастайныя апублікаваныя крыніцы, які дапамагаюць больш аб'ектыўна прасачыць ход і вынікі інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі.

**Метадалогія даследавання.** Метадалагічную аснову дысертацыйнага даследавання складаюць прынцыпы гістарызму, аб'ектыўнасці, сістэмнасці і аксіялагізму, што дазволіла крытычна даследаваць, параўнаць і сінтэзаваць інфармацыю з розных крыніц. Для дасягнення мэты выкарыстоўваліся канкрэтна-гістарычныя (праблемна-храналагічны, гісторыка-генетычны, апісальны, параўнальны, тыпалагічны) і агульнанавуковыя метады (лагічны, індуктыўны, дэдуктыўны, сінтэзу) метады. Для пацверджання гістарычнай дакладнасці атрыманых вынікаў быў выкарыстаны метад кантэнт-аналізу крыніц, які дазволіў надзейна вызначыць тэндэнцыю да колькаснага памяншэння шляхты.

У другой главе **«Уваходжанне тытулаваных родаў беларускіх зямель у склад арыстакратыі Расійскай імперыі»** разглядаецца роля арыстакратыі ў працэсе інтэграцыі шляхты шляхты беларускіх зямель у склад расійскага дваранства. Асобна адзначаецца, што паходжанне тытулаў у гэтай групы вышэйшага саслоўя не было падобным на тытулы расійскіх дваранскіх родаў. Асвятляецца дэвальвацыя княскага тытула на землях былой Рэчы Паспалітай, апісваюцца роды, якія мелі тытул князёў Свяшчэннай Рымскай імперыі, іх роля ва ўзбагачэнні расійскай арыстакратыі.

Асобна разглядаецца пытанне прызнання тытулаў у Прускім каралеўстве і Аўстрыйскай імперыі, параўноўваецца становішча, у якім апынуліся тытулаваныя роды Рэчы Паспалітай пасля яе падзелаў. Паказваецца, што напачатку ў Расійскай імперыі становішча тытулаваных фамілій было адносна лягчэйшым. Нават прадстаўнікі княскіх фамілій, якія пацвердзілі свае тытулы за мяжой, з лёгкасцю захоўвалі свой статус у Расіі. Даследуюцца спосабы пацверджання высакароднага паходжання ў Аўстрыі, Прусіі і Расіі. Падкрэсліваецца, што аўстрыйскія ўлады пайшлі на ператварэнне сугучных пасадаў Рэчы Паспалітай у графскі тытул, а пруская каралеўская дынастыя парадніліся з Радзівіламі. Гэтыя захады тлумачацца намі як спосабы прыцягнення на свой бок вышэйшых пластоў шляхты з мэтай павелічэння

матэрыяльных магчымасцяў гэтых дзяржаў і захавання лаяльных настрояў у шэрагах арыстакратыі былой Рэчы Паспалітай.

Прасочваецца паходжанне найбольш вядомых тытулаваных родаў, упісаных у радаводныя кнігі «літоўскіх» і «беларускіх» губерняў, іх інтэграцыя ў расійскую арыстакратыю. Князі Радзівілы праявілі розныя імкненні ў працэсе інтэграцыі ў склад дваранства Расійскай імперыі. Князь Дамінік Радзівіл актыўна выявіў на баку Напалеона I, Алена Радзівіл, наадварот, была на баку Аляксандра I.

Жыццё Льва Людвігавіча Радзівіла ілюструе супрацьлегласць і складанасць інтэграцыі ў расійскае дваранства. Спачатку выступаючы на баку царскага ўрада, ён удзельнічаў у падаўленні паўстання 1830—1831 гг. Але западозрыўшы сваю жонку ў сувязі з імператарам Мікалаем I, Л. Л. Радзівіл пакінуў Расію.

Складаны лес ў Расійскай імперыі быў у князёў Сапегаў. Прысягнуўшы на вернасць Кацярыне II, Сапегі хутка пакінулі свае маёнткі і ўдзельнічалі ў антырасійскіх выступленнях у вайне 1812 г. і паўстанні 1830—1831 гг. За такі сепаратызм яны былі пазбаўленыя сваіх уладанняў у Расійскай імперыі. Натуралізацыю Сапегі праходзілі ў Аўстрыі і Вялікабрытаніі, а ў дзяржаве Раманавых—толькі ў канцы XIX ст.

Супрацьлеглым шляхам ішла інтэграцыя ў склад расійскай арыстакратыі роду князёў Любамірскіх. Яны не толькі адны з першых прысягнулі расійскім уладам, але і здолелі парадніцца з правячай дынастыяй. Князь Францішак Ксаверый-Станіслаў Любамірскі быў жанаты на Марыі Львоўне Нарышкінай. Гэта паспрыяла кар'еры прадстаўнікоў адзначанага роду ў Расійскай імперыі. З Нарышкінымі былі ў сваяцкіх сувязях і князі Святаполк-Чацвярцінскія, якія таксама інтэграваліся ў расійскую арыстакратыю.

Паказваецца сутнасць выключных выпадкаў атрымання беларускімі родамі тытулаў у Расійскай імперыі. Такое прызнанне адбылося з князямі Святаполк-Мірскімі, якія ў Рэчы Паспалітай князямі не былі, але дзякуючы сваім заслугам у ваеннай службе на Каўказе, у прыватнасці захопу ў палон Шаміля, і набліжанасці да імператарскага двара, яны сталі князямі.

Адаптавацца ў новых умовах змаглі князі Друцкія-Любецкія. З гэтай фаміліі найбольш вылучаецца Ксаверый Францавіч, які займаў разнастайныя службовыя пасады ў Расійскай імперыі і Царстве Польскім.

Далёка не ўсе тытулаваныя роды беларускіх зямель змаглі пацвердзіць свой сацыяльны статус. Толькі адна з галін князёў Гедройцаў пацвердзіла свой тытул. Князі Свірскія ўвогуле не змаглі даказаць сваё паходжанне. З іншага боку, некаторыя татарскія роды даказалі сваё высакароднае паходжанне.

Падобным чынам ішла інтэграцыя ў склад расійскай арыстакратыі графскіх і баронскіх сямей Беларусі. З графаў найбольш вылучыліся графы Чапскія.

Нароўні з нетытулаванай шляхтай даказвалі сваё паходжанне графы Грабоўскія і Корвін-Касакоўскія. Выдатна ілюструе працэс інтэграцыі ў склад арыстакратыі Расійскай імперыі жыццё графа Канстанціна Развадоўскага. Ён не толькі вызначыўся на вайсковай службе, але і быў жанаты на рускай дваранцы.

Графы Борхі былі набліжаны да імператарскага двара, мелі прыдворныя чыны. Інакш глядзелі на праблему ўладкавання ў новых умовах Плятэры. Прадстаўнікі гэтага графскага рода вядомы як удзельнікі паўстання 1830—1831 гг.

Баронскія роды, упісаныя ў радаводныя кнігі «літоўскіх» і «беларускіх» губерняў, не вызначыліся як сепаратысты. Але прызнанне іх тытулаў зацягвалася на доўгі час. Гэта звязана з дастаткова нязначнымі пасадамі і званнямі, якімі яны былі надзелены. Канчатковае прызнанне тытулаў магло займаць доўгі тэрмін не толькі ў баронаў, але і ў князёў і графаў. З іншага боку, гэта было толькі першым крокам у працэсе інтэграцыі ў склад расійскай арыстакратыі. Пераважная большасць тытулаваных родаў беларускіх зямель найперш вылучылася на вайсковай ці цывільнай службе, а таксама парадніліся з прадстаўнікамі расійскага дваранства. Апошні факт сведчыць пра прыманне тытулаваных фамілій былой Рэчы Паспалітай у шэрагах расійскай арыстакратыі як роўнай. Уключэнне тытулаваных шляхецкіх родаў Беларусі ў агульны гербоўнік Расійскай імперыі быў вышэйшай адзнакай інтэграцыі ў склад расійскага дваранства. Гэта той фармальны момант, які паказваў, што пэўны прадстаўнік арыстакратыі беларускіх зямель нічым не вылучаецца з шэрагаў імперскага дваранства. У агульны гербоўнік унесены князі Святаполк-Чацвярцінскія, Святаполк-Мірскія, Сапегі, графы Чапскія, Развадоўскія інш.

Адзінае, з чым не змагла зміырыцца арыстакратыя былой Рэчы Паспалітай, стала страта ўдзелу ў кіраванні дзяржавай. Паралельна з інтэграцыяй у склад расійскага дваранства, яна ўдзельнічала ў антырасійскіх выступленнях. Але паступова старыя традыцыі саступаюць месца новым, і ўжо ў канцы XIX ст. прадстаўнікі тытулаваных родаў беларускіх зямель паўстаюць у ролі правадыроў дзяржаўнай палітыкі на Беларусі. Нават нашчадкі ўдзельнікаў антыўрадавых выступленняў зарэкамендавалі сябе як верныя падданыя Расійскай імперыі.

Трэцяя глава **«Інтэграцыя нетытулаванай шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі»** прысвечана праблеме адаптацыі ў новай сацыяльна-палітычнай сістэме пераважнай большасці шляхты—той, якая не мела тытулаў.

Найперш, асвятляюцца пытанні прысягі шляхты новым уладам. Падкрэсліваецца, што гэты палітычны акт шляхта здзейсніла, гледзячы на прыклад свайго сацыяльнага лідара—арыстакратыі. Акрамя таго, масавай прысяге паспрыяў страх страціць сваю маёмасць.

Прасочваецца парадак вызначэння прыналежнасці той ці іншай шляхецкай фаміліі да дваранства. Ён быў усталяваны «Жалаванннай граматай дваранству», якая канкрэтызавала пытанне аргументацыі запісу беларускай шляхты ў шостую частку радаводнай кнігі. Гэтым самым улады фармальна ліквідавалі ўсялякую адасобленасць шляхты заходніх губерняў ад карэннага расійскага дваранства.

У дадзенай главе раскрываецца папярэдні вопыт расійскіх уладаў па нівеліроўцы адрозненняў «окраинного» і ўнутранага дваранства. Такія мерапрыемствы праводзіліся ў Расійскай імперыі яшчэ ў XVII—XVIII ст., калі смаленская шляхта паступова была аддалена ад культурных асяродкаў на захадзе, а потым русіфікавалася.

Вывучэнне архіўных фондаў губернскіх дваранскіх сходаў дазваляюць казаць аб тыповай сітуацыі з пацверджаннем шляхецтва, якая склалася на беларускіх землях. Захаванне дваранскага статусу ў Расійскай імперыі дазваляла карыстацца шэрагам прывілеяў. Але такі сацыяльны статус спачатку неабходна было зацвердзіць. Працэс гэты быў двухступенны: спачатку прызнанне на губернскім узроўні, а потым—на агульнадзяржаўным. Аднак высветленыя намі абставіны гэтага працэсу дазвяляюць казаць аб яго доўгіх тэрмінах, калі справа аб канчатковым вырашэнні дваранскага статусу нетытуляванай шляхты беларускіх зямель зацягвалася на дзесяцігоддзі. Прычым неабходна заўважыць адну цікавую акалічнасць. Калі ў Віленскай і Гродзенскай губернях шляхта атрымлівала станоўчыя рашэнні губернскіх дваранскіх сходаў на мяжы XVIII—XIX ст., а указы Герольдыі аб прызнаных у расійскім дваранстве выходзяць, у асноўным, у 1830—1840-я гг., то па астатніх губернях гэтыя тэрміны значна больш індывідуялізаваны. Адначасова раскрываюцца праблемы ўдзелу шляхты ў дваранскіх выбарах і прыстасаванні апошніх да старых соймавых традыцый. Вынікам гэтага сталі шматлікія парушэнні пад час іх правядзення. Часта на выбарныя пасады абіралі асоб, якія не мелі на гэта права. Так стала па прычыне выкарыстання гэтых пасадаў як сродкаў абагачэння. Такі падыход да дваранскіх выбараў прывёў да сітуацыі, калі мясцовая шляхта практычна не жадала служыць на дзяржаўных службовых пасадах, аддаючы перавагу менавіта выбарным. Гэта была супрацьлеглая сітуацыя, якая не адпавядала той, што склалася ва ўнутраных расійскіх губернях. Там наадварот, дваранства імкнулася ўвайсці ў склад чынавенства, і зусім не жадала ўдзельнічаць у дваранскіх выбарах. У гэтай сітуацыі праявіўся розны падыход шляхты былой Рэчы Паспалітай і дваранства да праблемы кар'еры. Вытокі гэтых адрозненняў неабходна шукаць у розных культурных асяродках, у якіх знаходзіліся гэтыя дзве групы насельніцва. Сучаснікі характарызавалі карэннае расійскае дваранства як бязвольных кар'ерыстаў, а

шляхту заходніх губерняў як поўную шляхецкага гонару, кансерватыўную карпарацыю.

Са злоўжываннямі выбарных службовых асоб звязана таксама колькаснае павелічэнне дваранства ў заходніх губернях. Гэта прывяло да сітуацыі, калі колькасць дваран на землях былой Рэчы Паспалітай на 145 тысяч чалавек пераўзыходзіла колькасць усяго астатняга дваранства Расійскай імперыі.

Некаторыя нетытулаваныя шляхецкія роды беларускіх зямель нават трапілі ў Агульны гербоўнік Расійскай імперыі. Сярод іх былі Каменскія, Галынскія, Шэміёты.

Аднак галоўным сродкам інтэграцыі нетытулаванай шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі стала ўсё ж бытавая, якая найбольш выразна праявілася ў «беларускіх» губернях. Мясцовая шляхта запазычыла рускую мову, а ў мясцовых уладаў паступова павялічылася ступень даверу да яе.

Галоўнай перашкодай на шляху інтэграцыі нетытулаванай шляхты беларускіх зямель была жывучасць старых соймавых традыцый, якія дастаткова марудна саступалі месца новым. Асноўным паказчыкам інтэграцыі шляхты ў склад дваранства Расійскай імперыі стала, такім чынам, працягласць яе знаходжання ў расійскім падданстве.

У чацвёртай главе **«Разборы» шляхты як сродак дзяржаўнай саслоўнай палітыкі»** даследуюцца пытанні змяншэння колькасці шляхты беларускіх зямель.

Паказваецца, што галоўным матывам такой палітыкі было не нацыянальнае прыцясненне «былой польскай шляхты», а імкненне цэнтральных уладаў да захавання колькасных суадносін паміж дваранствам і шляхтай заходніх губерняў. Існавала тэарэтычная верагоднасць паглынання ўласнага расійскага дваранства шляхтай. Акрамя таго, неразуменне новымі ўладамі мясцовых умоў прывяло да таго, што ў шляхецкае саслоўе запісалася вялікая колькасць асоб, якія такой годнасцю не валодалі. Не вылучалася дробная шляхта і з ліку сялянства. Каб не размываць сваю асноўную сацыяльную апору ў заходніх губернях, а таксама па фіскальных меркаваннях, улады імкнуліся перавесці гэтых асоб у падатныя саслоўі.

Асвятляюцца канкрэтныя захады ўладаў па скарачэнні колькасці шляхты. Аналізуюцца непаслядоўныя меры, якія часта не прыводзілі да чакаемых вынікаў. У прыватнасці, адзначаецца, што працэс перагляду правоў на дваранства ў 30-я гг. XIX ст. толькі інтэнсіфікаваў колькаснае павелічэнне шляхты на беларускіх землях, аб які сведчаць як нашы назіранні, так і статыстычныя крыніцы.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць наступныя высновы:

1. Падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі становішча шляхты, у цэлым, не змянілі. Адзінае, што перажыло вышэйшае саслоўе, стала рэзкае абмежаванне яго палітычных правоў. У абмен на прысягу імператарскаму прастолу шляхта захавала свае ранейшыя маёмасныя пазіцыі і, нават, павялічыла аб'ём феадальнай рэнты. Такі падыход да шляхты беларускіх зямель намі патлумачаны з пазіцый разумення яе цэнтральнымі расійскімі ўладамі як апоры феадальнай па сваёй сутнасці дзяржавы на навадалучаных тэрыторыях [1, 2].

У асноўнай сваёй масе шляхта беларускіх зямель прысягнула новым уладам. Яна ставіла свае маёмасныя інтарэсы вышэй за ўсе астатнія. Асобы, якія не пажадалі служыць Санкт-Пецярбургу, складалі зусім невялікую частку набілітэту. Аднак і для гэтых асоб, асабліва тых, якія мелі тытулы, царскі ўрад на працягу канца XVIII—першай паловы XIX ст. захоўваў магчымасці да вяртання сваіх уладанняў.

2. Уладамі Расійскай імперыі шляхта беларускіх зямель разглядалася як роўная свайму карэннаму дваранству. Распаўсюджванне на беларускія землі «Жалаваннай граматы дваранству» сведчыць аб тым, што кіраўніцтва Расійскай імперыі ў асобе імператрыцы Кацярыны II не бачыла неабходнасці ліквідацыі шляхты як сацыяльнай групы. Наадварот, прасочваецца імкненне да фактычна поўнага ўключэння ў шэрагі расійскага дваранства шляхты былой Рэчы Паспалітай цалкам. Асобна неабходна адзначыць стаўленне да тытулаванай шляхты, арыстакратыі, як да меўшай нават больш глыбокія карані радавітасці, чым арыстакратыя расійская. Невыпадкова набліжэнне тытулаваных родаў, якія былі ўключаны ў шэрагі арыстакратыі Расійскай імперыі звычайна дастаткова лёгка ўваходзілі ў склад імператарскага акружэння і нават парадняліся з прадстаўнікамі кіруючай дынастыі [2].

Такую ж пазіцыю займалі ўлады астатніх дзяржаў, падзяліўшых Рэч Паспалітую. Асабліва вылучылася ў гэтым накірунку дынастыя Гогенцолернаў, якая ўтварыла шлюбны саюз паміж дачкой прускага прынца Аўгуста Фердынанда Луізай і Антоніем Генрыкам Радзівілам [3].

3. Далучыўшы да Расійскай імперыі беларускія і украінскія землі, афіцыйныя ўлады неаднаразова падкрэслівалі, што гэта не была анэксія. Тагачасная афіцыйная ідэалогія Расійскай імперыі тлумачыла яе поўнае права на валоданне ўсходнеславянскімі землямі. Менавіта з гэтай прычыны шляхта, якая апынулася ў расійскім падданстве, не зведала такога моцнага нацыянальнага

уціску як тая яе частка, што трапіла ў Прускае каралеўства і Аўстрыйскую імперыю. Спробы стварыць нацыянальна-культурную аўтаномію для палякаў у гэтых дзяржавах былі, фактычна, толькі намінальнымі. У Расійскай імперыі, у сваю чаргу, да 30-х гг. XIX ст. шляхта заходніх губерняў не толькі захоўвала поўныя правы ў судовай галіне, але і свабодна карысталася ў афіцыйных зносінах з мясцовымі органамі ўлады польскай мовай. Не было ў гэты час і рэлігійнага ўціску [1].

4. Галоўнай праблемай для ўладаў Расійскай імперыі ў працэсе інтэграцыі шляхты ў склад расійскага дваранства стала вялікая яе колькасць. Справа не ў тым, што Санкт-Пецярбург баяўся яе інтэграцыі ў дваранства, а ў заклапочаннасці тэарытычна магчымым паглынаннем, асіміляцыяй усяго расійскага дваранства шляхтай былой Рэчы Паспалітай. Гэта стала адной з асноўных прычынаў імкнення да памяншэння яе колькасці. На карысць такой палітыкі гаварыла і імкненне захаваць вышэйшае саслоўе Расійскай імперыі ад размывання дакладна вызначаных яго межаў. У дзяржаве ў канцы XVIII—сярэдзіне XIX ст. дваранства ўяўляла сабой галоўную апору самадзяржаўя. Прадстаўнік гэтага саслоўя звычайна быў землеўласнікам, эксплуатаваў прыгонных сялян, ці служыў дзяржаве на вайсковай або цывільнай службе. На землях былой Рэчы Паспалітай, у тым ліку беларускіх, вялікая колькасць шляхты не мела ні зямлі, ні прыгонных. Не жадала яна служыць таксама і на дзяржаўнай службе. Атрымлівалася, што дробная шляхта не выконвала ўскладзеных на яе сацыяльных функцый. Натуральна, што такя сітуацыя нараджала справядлівыя сумненні ўладаў аб неабходнасці інтэграцыі гэтай часткі шляхты ў склад дваранства Расійскай імперыі.

Самае галоўнае, што служба дзяржаве стала адным з асноўных спосабаў інтэграцыі шляхты ў расійскае дваранства. Дастаткова вялікая колькасць асоб, якія вызначыліся ў вайсковых аперацыях расійскай арміі, атрымалі пацверджанне дваранскіх правоў, а асобныя нават і тытулаў. Гэтакія ж магчымасці давала служба на цывільных пасадах, шлюбныя сувязі з карэнным расійскім дваранствам, а таксама ўключэнне ў геральдычную сістэму Расійскай імперыі [1, 3, 4, 5].

Паспяховасць працэсу інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад расійскага дваранства залежала таксама і ад бытавых стасункаў з яго прадстаўнікамі. Такую выснову можна зрабіць пасля аналізу грамадскага жыцця вышэйшага саслоўя на беларускіх землях. Асабліва паспяховай бытавая інтэграцыя шляхты ў расійскае дваранства была ва ўсходніх, «беларускіх» губернях, якія даўжэй знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі і дзе мацнейшым было этнічна рускае землеўладанне [5].

5. Першыя дзесяцігоддзі знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі выявілі асаблівасці прыстасавання мясцовай шляхты да новых умоў. Найбольш паказальным стала прыстасаванне старых соймавых традыцый да новай сістэмы дваранскіх выбараў. У дадзенай галіне праявіўся пэўны кансерватызм «вяльможнага панства», а таксама характэрнае для яго імкненне да ўзбагачэння за кошт займаемых выбарных пасад. Стваралася сітуацыя, якая нагадвала ранейшыя парадкі, калі вырашэнне судовых спраў залежала толькі ад фінансавых магчымасцяў удзельнікаў працэсу. Заплаціўшы належныя сумы грошай выбраным засядацелям у судзе, можна было разлічваць на станоўчае вырашэнне справы. Увогуле, канец XVIII ст. і першыя дзесяцігоддзі XIX ст. выявілі канкрэтныя тэндэнцыі да стварэння шляхтай пад час выбараў нейкага падабенства колішніх канфедэрацый.

Частка шляхты праявіла свае антырасійскія настроі праз удзел у паўстаннях. Для перыяду да 60-х гг. XIX ст. гэткая тэндэнцыя была, хутчэй, звязана з незадаволенасцю сваім становішчам у сацыяльнай структуры расійскага грамадства, а не з нацыянальнымі інтарэсамі [1, 4].

6. Вынікі інтэграцыі шляхты беларускіх зямель яскрава сведчаць, што услед за сваім лідарам—арыстакратыяй—шляхта ў цэлым паспяхова інтэгравалася ў склад дваранства Расійскай імперыі. Нават тытулаваныя роды, якія ў першай палове XIX ст. удзельнічалі ў антырасійскім руху, сталі складовай часткай вышэйшага саслоўя гэтай дзяржавы. Канкрэтныя прыклады сведчаць, што сваёй лаяльнасцю да ўладаў шляхта імкнулася атрымаць выгаду ад свайго становішча [4].

**Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў**

Змешчаны ў дысертацыі фактычны матэрыял і вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы спецыяльнай манаграфіі, а таксама пры распрацоўцы лекцый і спецыяльных курсаў па гісторыі Беларусі, пры напісанні абагульняючых прац, падручнікаў па гісторыі Беларусі. Асаблівую цікавасць дысертацыйнае даследаванне ўяўляе для спецыялістаў, якія вывучаюць гісторыю сацыяльных адносін і саслоўную гісторыю Беларусі часоў знаходжання яе ў складзе Расійскай імперыі. Менавіта на прыкладзе інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі можна прасачыць асаблівасці ў сацыяльна-палітычным жыцці Беларусі канца XVIII—сярэдзіны XIX ст. і мерапрыемствы ўраду па прыцягненню мясцовай шляхты ў саслоўную структуру імперыі. Акрамя таго, выкарыстанне вынікаў даследавання магчыма пры распрацоўцы праблем гісторыі дзяржавы і права Беларусі, паліталогіі (тэорыя палітычных эліт і інш.).

Вынікі даследавання таксама ўзбагачаюць ідэалогію беларускай дзяржавы ў частцы гістарычнага вопыту інтэграцыі вышэйшых сацыяльных слаёў грамадства Беларусі і Расіі ў канцы XVIII—сярэдзіне XIX ст. Мяркуем, што вынікі даследавання дазваляюць глыбей зразумець сучасныя інтэграцыйныя працэсы паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй.

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў навуковых часопісах


1. Дамарад, А. А. Аб пацвярджэнні дваранства шляхтай Віленскай і Гродзенскай губерняў (Па матэрыялах Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва) / А. А. Дамарад // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2007. – № 4. – С. 45–52.

2. Дамарад, А. А. Аб шляхах інтэграцыі арыстакратыі беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі (канец XVIII—сярэдзіна XIX ст.) / А. А. Дамарад // Весці НАН Беларусі. Сер. гум. Навук. – 2007. – № 5. – Ч. 1. – С. 73–76.


### Артыкулы ў зборніках навуковых прац


3. Дамарад, А. А. Агульны гербоўнік дваранскіх родаў Расійскай імперыі як крыніца па саслоўнай гісторыі Беларусі / А. А. Дамарад // Труды БГТУ. Сер. V. Политология, философия, история, филология. – Минск: БГТУ, 2005. – Вып. XIII. – 222 с.

4. Дамарад, А. А. Інкарпарацыя вышэйшай арыстакратыі беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі (канец XVIII—першая палова XIX ст.) / А. А. Дамарад // Труды БГТУ. Сер. V. Политология, философия, история, филология. – Минск: БГТУ, 2006. – Вып. XIV. – С. 132–133.


### Тэзісы дакладаў


5. Дамарад, А. А. Шляхі інтэграцыі шляхты ў склад дваранства Расійскай Імперыі / А. А. Дамарад // НИРС 2005. Сборник тезисов докладов X республиканской научной конференции студентов и аспирантов Республики Беларусь (14-15 февраля 2006 г.), Минск, 2005. – С. 205–206.

## РЭЗЮМЕ

**Дамарад Аляксей анатольевіч**

**Інтэграцыя шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі**

**Ключавыя словы:** інтэграцыя, шляхта, дваранства, арыстакратыя, тытутлы, беларускія землі, Расійская імперыя, ваенная служба, цывільная служба, геральдычная сістэма, «разборы» шляхты, дваранскі дэпутацкі сход.

Аб'ектам дысертацыйнага даследавання з'яўляецца сацыяльна-палітычная гісторыя Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII—сярэдзіна XIX ст.). Прадмет даследавання—працэс інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад расійскага дваранства. Мэта дысертацыйнага даследавання: устанаўленне дакладнага характару інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі ў канцы XVIII—сярэдзіне XIX ст. Метадалагічную аснову дысертацыйнага даследавання склалі гісторыка-сістэмный і канкрэтна-гістарычныя метады.

**Навуковая навізна** дысертацыі вызначаецца тым, што упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі, на аснове шырокага кола літаратуры і крыніц, праведзена комплекснае даследаванне ўнутрысаслоўнай інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі, раскрыты прычыны імкнення асобных падстаўнікоў шляхты да такой інтэграцыі, выяўлены шляхі і механізм гэтага працэсу. Вынікі працы дазваляюць часткова закрыць шырокі прабел у айчыннай гістарыяграфіі, таму што такія гістарычныя і паліталагічныя аспекы двухбаковых адносін шляхты і уладаў Расійскай імперыі ў разглядаемы перыяд не станавіліся раней прадметам адмысловага вывучэння айчынных гісторыкаў.

Матэрыял дысертацыі можа быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы лекцыйных і спецыяльных курсаў, вучэбных дапаможнікаў і праграм, для напісання манаграфій, праектаў і навуковых артыкулаў, у тым ліку па гісторыі дзяржавы і права Беларусі і паліталогіі. Вынікі дысертацыі таксама ўзбагачаюць ідэалагічныя асновы беларускай дзяржаўнасці.

# РЕЗЮМЕ

**Доморад Алексей Анатольевич**

**Интеграция шляхты белорусских земель в состав дворянства Российской империи**

**Ключевые слова:** интеграция, шляхта, дворянство, аристократия, титулы, белорусские земли, Российская империя, военная служба, гражданская служба, геральдическая система, «разборы» шляхты, дворянское депутатское собрание.

Объектом диссертационного исследования является социально-политическая история Беларуси в составе Российской империи (конец XVIII—середина XIX в.). Предмет исследования—процесс интеграции шляхты белорусских земель в состав российского дворянства. Цель диссертационного исследования—установление точного характера интеграции шляхты белорусских земель в состав дворянства Российской империи в конце XVIII—середине XIX в. Методологическую основу диссертации составили историко-системный и конкретно-исторические методы.

**Научная новизна** диссертации определяется тем, что впервые в отечественной историографии, на основе широкого круга литературы и источников, проведено комплексное исследование внутрисословной интеграции шляхты белорусских земель в состав дворянства Российской империи, раскрыты причины стремления отдельных представителей шляхты к такой интеграции, выявлены пути и механизм этого процесса.

Результаты работы позволяют частично закрыть широкий пробел в отечественной историографии, потому что такие исторические и политологические аспекты двухсторонних отношении шляхты и российских властей в рассматриваемый период не становились ранее предметом изучения отечественных историков.

Материал диссертации может быть использован при подготовке лекционных и специальных курсов, учебников и программ, для написания монографий, в том числе по истории государства и права Беларуси и политологии. Результаты диссертации также обогащают идеологические основы белорусской государственности.

## SUMMARY

**Damarad Aliaksei Anatolievich**

**The integration of the shlachta of the Belarussian grouns into the structure of Russian empire nobility**

**Key words:** integration, shlachta, nobility, aristocracy, titles, Belarussian grounds, Russian empire, military service, civil service, heraldic system, shlachta "razbors", nobility deputy assembly.

Object of dissertational research is social-political history of Belarus in the structure of Russian empire. Subject of dissertational research is the process of the Belarussian grounds shlachta integration into Russian empire nobility. The purpose of work is the determination of the character of the integration of the shlachta of the Belarussian grouns into the structure of Russian empire nobility (late XVIII—middle XIX century. The methodological basis of dissertational research was made with historic-system and specific historical methods.

**The scientific novelty** of the dissertation is determined by that for the first time in domestic historiography, on the basis of the rich literature and sources, complex research of the integration of the shlachta of the Belarussian grouns into the structure of Russian empire nobility, motives of such activity are revealed, ways and mechanism of it process are discovered.

Results of work allow to close in part a big blank in a domestic historiography because neither historical nor political aspects of such relations between shlachta and Russian authority during the considered period become earlier a subject of special studying of domestic historians.

The material of the dissertation can be used by preparation lecture and special courses, manuals and programs, and also for a spelling of monographies, projects and scientific articles. Results of dissertational also enrich the ideology of the Belarussian state.




2Н//26539

Нацыянальная бібліятэка Беларусі